# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 10 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Пазнайце слова па яго лексічным значэнні і вызначце яго родавую прыналежнасць. Адказы запішыце ў адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| **запіс** | *Пісьмовая перадача, змест чаго-н.; запісаныя на паперы думкі, заўвагі і пад.* | *м. р.* |

*Словы для даведкі:* бездараж, брыль, гаць, рукапіс, цемрадзь, шынель.

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| | Форменнае паліто спецыяльнага пакрою, са складкай на спіне і хлясцікам | |
| | Галаўны ўбор; казырок шапкі | |
| | Непраходнасць дарог; адсутнасць або недахоп добраўпарадкаваных дарог | |
| | Насціл з бярвення, галля, ламачча для праезду цераз балота ці гразкае месца | |
| | Помнік старажытнага пісьменства; тэкст, напісаны ад рукі | |
| | Адсутнасць святла, густы змрок; цемната | |

**Заданне 2.** Слова можа мець адну, дзве, тры прыстаўкі. А можа не мець іх зусім. Размяркуйце наступныя словы па асобных слупках табліцы. У кожным з прапанаваных слоў вызначце прыстаўку (прыстаўкі).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Скрутак, абясшкодзіць, беззаганны, абуць, непахісны, абавязак, абаронца, абняць, выбары, высакамерны, выкладчыца (фізікі), пераапрануцца.

| Словы без прыстаўкі | Словы з адной прыстаўкай | Словы з дзвюма прыстаўкамі |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 3.** Падбярыце да шасці з сямі слоў, пададзеных у табліцы, такія словы з наступнага абзаца, каб ад асноў кожнай пары можна было ўтварыць неказіянальныя складаныя назоўнікі або прыметнікі (г. зн. яны павінны змяшчацца ў нарматыўных слоўніках літаратурнай мовы). Упішыце па шэсць падабраных і ўтвораных слоў у адпаведныя ячэйкі табліцы. Насупраць незапатрабаванага слова пастаўце ў другім і трэцім слупках прочырк.

*Ахаваць, воля, вызначаць, значыць, ствараць, улада.*

**Заўвага:** аснова слова з першага слупка павінна ў складаным слове ісці першай, а ў другім слупку ніводнае слова не павінна паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| | | |
|---|---|---|
| *кніга* | *друкаваць* | *кнігадрукаванне* |

| | | |
|---|---|---|
| *лес* | | |
| *лёс* | | |
| *народ* | | |
| *першы* | | |
| *роўны* | | |
| *свой* | | |
| *слова* | | |

**Заданне 4.** Вывучэнне геаграфіі Беларусі ўключае ў сябе апісанне разнастайных прыродных кампанентаў і рэсурсаў. Раскрыйце дужкі і размясціце назвы геаграфічных паняццяў у адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

(Балтыйска)Чарнаморскі водападзел
(Верхня)нёманская нізіна
(водна)ледавіковыя раўніны
(палітыка)геаграфічнае становішча
(фізіка)геаграфічнае раянiраванне
(цяжка)даступныя прыродныя рубяжы

| **Злітнае напісанне** | **Напісанне праз дэфіс** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 5.** У заданні ўсе прыклады згрупаваны па пэўнай граматычнай прымеце. Але ў кожнай групе ёсць лішні прыклад. Знайдзіце і запішыце яго нумар у адпаведным слупку. Патлумачце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| **Прыклады** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Від сувязі паміж словамі ў словазлучэнні:*<br>1) вясёлыя канікулы;<br>2) вывучыць верш;<br>3) мая кніга. | 2 | 1 і 3 – дапасаванне;<br>2 – кіраванне. |

| **Ілюстрацыйны матэрыял** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Простыя і складаныя сказы:*<br>1) Мне страшна, але іду (Я. Колас).<br>2) Чалавек, скажу вам, ніколі не павінен траціць веры ў жыццё (А. Пальчэўскі).<br>3) Паводле існуючай легенды, Магілёў быў закладзены ля магілы бясстрашнага змагара з сацыяльнай несправядлівасцю Машэкі (Л. Лыч). | | |
| *II. Від складанага сказа:*<br>1) Мінула шмат часу, пясчаныя кручы параслі травою і лесам, а яшчэ праз гады зацішныя мясціны на беразе ракі аблюбавалі пад жытло людзі… (М. Гіль).<br>2) Я выходжу на зялёны адхон і гляджу туды, дзе зусім яшчэ нядаўна было так многа вёсак, а цяпер бялеюць адны бярозы (В. Бялоў).<br>3) Вясною, калі пачыналі сеяць авёс, жураўы вярталіся з выраю, і іх песня ўжо не была такой журботнай, як увосень (А. Бялевіч). | | |
| *III. Від дададзенай часткі:*<br>1) Мартын імкнуўся выконваць даручэнне так, як рабіў бы сапраўдны партызан (Я. Колас).<br>2) Чуваць здалёку, як касцы мянташаць звонка косы (М. Калачынскі).<br>3) Яна [Яноўская] размаўляла пра каханне так, як іншыя жанчыны пра надвор’е (У. Караткевіч). | | |
| *IV. Сінтаксічная функцыя злучальнага слова:*<br>1) У тоне Славікавага адказу была пашана да Машы, што той вельмі падабалася (І. Шамякін).<br>2) Пум стаяў побач з зубранём, трос кудластай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога (Я. Зазека).<br>3) Што вінен, аддаць павінен (прыказка). | | |

**Заданне 6.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў. Для гэтага выкарыстайце прапанаваныя ў наступным абзацы словы, ужываючы іх у форме патрэбнага склону і ліку. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *вуха, грудзі, да, з, змяя, камізэлька, лоб, на, паўабарот, рана, свой, сцяна, у, увесь, хоць*.

**Заўвага:** адзін з дзеясловаў павінен быць ужыты не ў форме інфінітыва.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *заводзіцца* | ‘вельмі хутка даходзіць да ўзбуджанасці, узрушанасці, хвалявання’ | |
| *паплакаць* | ‘паскардзіцца некаторы час на свой лёс, каб расчуліць каго-н., выклікаць спагаду да сябе’ | |
| *прабіваць* | ‘рабіць гранічныя намаганні для дасягнення чаго-н.’ | |
| *пратрубіць* | ‘надакучыць пастаяннымі размовамі пра што-н.’ | |
| *прыгрэць* | ‘зрабіць дабро чалавеку, які пасля адплаціў няўдзячнасцю’ | |
| *прыкладаць* | ‘хто-н. вельмі пакорлівы, памяркоўны, згаворлівы’ | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6*.**

Фигурка изображала двух человечков, нищих музыкантов, со скуластыми монгольскими лицами, узкими щелочками глаз и приплюснутыми носами. Крохотная деревянная скульптура, размером со спичечную коробку, не больше. Музыканты шли сквозь дождь и ветер, их лохмотья развевались, желтые лица были опалены солнцем. По выражению их лиц, по растянутым ртам было видно, что они поют нечто жалобное, однообразное, привычное. *(По А. Рыбакову.)*

**Заданне 8.** Суаднясіце назвы родаў (міжродавага ўтварэння), прыклады жанраў (цвёрдых форм вершаў) і ўзоры мастацкіх твораў. Адказ запішыце ў наступным спалучэнні: літара – рымская лічба – арабская лічба (напрыклад: А-IV-2).

*Максімальная колькасць балаў –* ***6*.**

| | | |
|---|---|---|
| А Эпас | I Апавяданне, аповесць | 1 “Новая зямля” Якуба Коласа, “Маці” А. Куляшова |
| Б Лірыка | II Камедыя, драма | 2 “Роднае карэнне” М. Гарэцкага, “Непаўторная вясна” І. Шамякіна |
| В Драма | III Трыялет, санет | 3 “Калісь глядзеў на сонца я…” і “Замёрзла ноччу шпаркая крыніца” М. Багдановіча |
| Г Ліра-эпас | IV Байка, апавяданне | 4 “Паўлінка” Янкі Купалы, “Вечар” А. Дударава |
| | V Паэма, балада | 5 “Дыпламаваны баран” Кандрата Крапівы, “На каляды к сыну” Змітрака Бядулі |
| | VI Санет, паэма | 6 “Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…” М. Багдановіча, “Курган” Янкі Купалы |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **А** | – | | – | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Б** | – | | – | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **В** | – | | – | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Г** | – | | – | |

**Заданне 9.** Пазнайце пісьменнікаў на партрэтах і падпішыце іх, выбраўшы з пераліку адпаведнае імя. Вызначце, гэта псеўданім ці сапраўднае імя (закрэсліце непатрэбнае). Калі псеўданім, то напішыце сапраўднае імя.

**Пералік імёнаў:** Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ, Максім Танк.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6*.**

*Узор:*

| | | |
|---|---|---|
|  | |  |
| Гэта ***Яўгенія Янішчыц*** | | Гэта ***Цётка*** |
| Імя сапраўднае / ~~псеўданім~~ | | Імя ~~сапраўднае~~ / псеўданім |
| Сапраўднае імя ____________________ | | Сапраўднае імя ***Алаіза Пашкевіч*** |



Гэта ______________________________

Імя сапраўднае / псеўданім
Сапраўднае імя _____________________



Гэта ______________________________

Імя сапраўднае / псеўданім
Сапраўднае імя _____________________



Гэта ______________________________

Імя сапраўднае / псеўданім
Сапраўднае імя _____________________



Гэта ______________________________

Імя сапраўднае / псеўданім
Сапраўднае імя _____________________



Гэта ______________________________

Імя сапраўднае / псеўданім
Сапраўднае імя _____________________

**Заданне 10.** У 2024 годзе мінула 105 гадоў з таго дня, як была надрукавана адна з найлепшых п’ес Янкі Купалы, у якой і назва, і кожная дзейная асоба нясуць сімвалічную нагрузку. Найбольш верагодна, што ў аснове сюжэту гэтага твора ляжыць сямейная трагедыя роду Луцэвічаў, звязаная са стратай зямлі. Здагадайцеся, пра які твор ідзе размова.

Уявіце сабе, што вы прымаеце ўдзел у стварэнні трэйлера да фільма па гэтай п’есе. Ваша задача – адабраць тры найбольш яркія эпізоды (павінны быць у тэксце твора), якія будуць уключаны ў трэйлер, патлумачыць свой выбар і напісаць закадравы тэкст (да 200 слоў). У тэксце неабходна прадставіць асноўных герояў, расказаць, пра што фільм, але пры гэтым захаваць інтрыгу. Памятайце, што тэкст пажадана звязаць з выбранымі эпізодамі.

***Для даведкі:*** *трэйлер – кароткі відэаролік, які складаецца з найбольш відовішчных фрагментаў фільма і выкарыстоўваецца для анонсу або рэкламы.*

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

Фільм будзе здымацца па п’есе “________________________________” Янкі Купалы

| **Апісанне эпізоду** | **Тлумачэнне выбару** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

***Закадравы тэкст***

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________